**60-ГОДДЗЮ ЎТВАРЭННЯ СССР — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!**

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1982
1
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 12 (1350)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

"Беларускі універсітэт"
**тэлетайп**
· Учора · Сёння · Заўтра ·

### АДЗНАКУ «ВЫДАТНА»

**ў час грамадска-палітычнай атэстацыі прафсаюзных актывістаў на чарговым пасяджэнні прэзідыума прафкома атрымалі В. Кананові, старшыня арганізацыйна-масавай камісіі прафкома, І. Каравацкі, старшыня прафбюро гістфака, Л. Дзіўнель, старшыня студсавета інтэрната № 7.**

**Р. МАРЧУК,**
**старшыня прэс-цэнтра прафкома.**

### ДВАНАЦЦАЦІГОДДЗЮ

**з дня нараджэння факультэта прыкладной матэматыкі прысвечана традыцыйнае на факультэце свята «Дні ФПМ». У праграме яго — дні адкрытых дзвярэй, спартыўныя спаборніцтвы, прэс-канферэнцыя з выкладчыкамі факультэта, святочны кірмаш, вечар сустрэчы з выпускнікамі, урачысты канцэрт.**

**І. КАНОНІК,**
**студэнтка І курса ФПМ.**

### ЛАЎРЭАТЫ

**інтэрнацыянальных студэнцкіх фестываляў палітычнай песні Алена Булыга і Алег Ацьман (студэнты філфака), а таксама супрацоўнік кафедры рускай мовы для замежных навучэнцаў, лаўрэат і дыпламант Усесаюзнага конкурсу лірычнай песні Л. Еранькоў сталі ўдзельнікамі вечара «Сустрэчы ля раяля», які адбыўся ў рэспубліканскім Доме мастацтваў.**

**Э. АНІСЕНКА,**
**мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.**

### НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СССР

**па класічнай барацьбе, які праходзіў у горадзе Баку, студэнт геафака В. Каржэль заняў другое месца. Упершыню выканаў нарматыў майстра спорту СССР па класічнай барацьбе на чэмпіянаце Цэнтральнага савета «Чырвонага Сцяга» студэнт геафака А. Харанека.**

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

## «Няма нічога другараднага...»

**ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА ДЭЛЕГАТА XIX З'ЕЗДА ВЛКСМ**



...ІШЛО чарговае пасяджэнне бюро камітэта камсамола універсітэта. Разглядаліся пытанні грамадска-палітычнай атэстацыі, асабовыя справы, зацвярджаліся характарыстыкі, рашаліся пытанні жыхарства ў інтэрнатах. Хлопцы і дзяўчаты, іншы раз не дачакаўшыся сваёй чаргі, усхопліваліся з месц, не вытрымліваючы рэгламенту, гаварылі пра тое, што хвалявала.

Сакратар больш маўчаў. Ён амаль не ўмешваўся, крэсліў нешта на лістку паперы. Але ў самы напружаны момант — пытаўся:

— Што будзем рабіць? Што перашкаджае актыўнасці?

І дабіўшыся яснага, канкрэтнага адказу, ён уводзіў гутарку ў патрэбнае рэчышча, неяк нябачна, быццам знутры, накіроўваў яе. Ён умеў вызначыць самую сутнасць праблемы і павесці патрэбную размову.

Аляксандру Мікалаевічу Рухлі, сакратару камітэта камсамола універсітэта, вельмі цяжка было знайсці час для разважлівай размовы.

— Вось вы пытаецеся, што ў мяне галоўнае на сённяшні дзень, — гаварыў ён, гартаючы каляндар. — Разумееце, у нашай рабоце няма нічога другараднага. Усё, чым камітэт камсамола займаецца, — галоўнае.

Сёння, напрыклад, яму абавязкова трэба прысутнічаць на семінары-вучобе сакратароў камсамольскіх арганізацый вобласці. Сакратар ён яшчэ малады, а ўменню кіраваць, весці за сабой таксама трэба вучыцца. Як змагчы так паставіць камсамольскую работу, каб узрушыць кожнага? Чаму гэта не заўсёды атрымліваецца? І чаму так здараецца, што калі тут, у камітэце камсамола, жыццё кіпіць, б'е ключом, то на ўзроўні курса «астывае», на ўзроўні групы наогул «замярзае»? Ён шукае адказаў, думае пра гэта.

— Я не разумею і адмаўляюся разумець тых маладых людзей, якія ў свае 17—18 гадоў ужо паспелі расчаравацца ў жыцці. На самай справе не ў жыцці яны расчараваліся, а ў сабе. Не жадаюць разумець, што прычына ў іх саміх, ва ўласнай інертнасці, пасіўнасці, абыякавасці. Галоўнае ж, не супакойвацца. Не знайшоў сябе ў адным, шукай у іншым. А дзеля гэтага трэба паспрабаваць усе свае магчымасці, здольнасці. Яны невычарпальныя.

Нядаўна А. М. Рухля быў выбраны дэлегатам XIX з'езда ВЛКСМ. Больш чым 10-тысячную камсамольскую арганізацыю БДУ будзе прадстаўляць ён на вышэйшым форуме камсамола краіны.

— Вучыўся на хімфаку БДУ, потым у ГДР, у Іенскім універсітэце імя Ф. Шылера. Там з'яўляўся старшынёй інтэрнацыянальнага студэнцкага камітэта. Дарэчы, напэўна там, у спецыфічных для сябе ўмовах, і навучыўся карпатлівай, сістэматычнай самаадукацыі. У шырокім сэнсе гэтага слова. І хоць быў па натуры чалавекам непаседлівым — шмат працаваў у чытальных залах. Потым нават павышаную стыпендыю атрымліваў.

У 1972 годзе спецыялістам у галіне радыяцыйнай хіміі вярнуўся ў БДУ. Захоплена займаўся навуковай работай. У А. М. Рухлі — 17 навуковых прац. Частка з іх выдадзена за мяжой. У маі 1975, калі праходзіў службу ў радах Савецкай Арміі, уступіў у члены КПСС. Потым зноў праца на хімфаку. Адначасова з'яўляўся сакратаром камсамольскай арганізацыі факультэта, членам камітэта камсамола універсітэта.

...У яго кабінеце заўсёды мнагалюдна. Першая прыкмета, і найбольш важная, яго ўменне працаваць з моладдзю. Часцей за іншых тут бываюць радыёфізікі, фізікі, філолагі.

— Гэта найбольш баявыя камсамольскія арганізацыі, — сказаў сакратар.

Калі ён трошкі высвабадзіўся ад неадкладных спраў, а да пасяджэння партггрупы заставалася пятнаццаць мінут, я запыталася:

— Што значыць, па-вашаму, быць сучасным дзелавым чалавекам? На адных з заняткаў ФГП нават дыскусія па гэтаму пытанню разгарнулася.

Ён на хвіліну задумаўся, адказаў:

— Быць дзелавым чалавекам —гэта, па-першае, ведаць, чаго ты хочаш, па-другое, валодаць важнай у сённяшнім жыцці якасцю — уменнем арганізаваць сябе, падзяліць свае магчымасці на ўсе справы, якімі даводзіцца займацца.

**А. ЛЫСЮК.**

## ДА СУСТРЭЧЫ, ХІМФАК!

У ГЭТЫ дзень лабараторыі хімфака «маладзеюць». Цішыня ў іх крыху больш урачыстая, чым у час звычайных заняткаў. Над колбамі і прабіркамі зачаравана ўвіхаюцца хлапчукі і дзяўчынкі — ідзе эксперыментальны тур Рэспубліканскай алімпіяды па хіміі школьнікаў 8—10-х класаў, які традыцыйна праводзіцца на базе хімічнага факультэта. Сем каманд (па 3 чалавекі ў кожнай) аб'ядноўваюць прадстаўнікоў усіх абласцей рэспублікі і асобна горада Мінска.

«Вызначыць састаў натроннай вапны, выкарыстоўваючы канцэнтраваную саляную кіслату і раствор гідраксіду калію...», — чытаю ўмову аднаго з практычных заданняў у дзевяцікласнікаў.

— У кожнага на стале — прылада для цітравання, — тлумачаць супрацоўнікі кафедры неарганічнай хіміі, якая «адказвае» за 9-я класы. — Яна спатрэбіцца для выканання другой задачы. Пры правядзенні эксперыменту правяраюцца ўсе атрыманыя вучнямі ў школе навыкі, а таксама ўменне сканцэнтраваць увагу, не губляцца ў нязвыклых умовах.

— Безумоўна, вялікую справу робіць факультэт, праводзячы такія алімпіяды, — уступае ў размову інспектар Міністэрства асветы БССР Таісія Рыгораўна Каленнікава. — Прадастаўленне школьнікам магчымасці самастойна папрацаваць у выдатна абсталяваных універсітэцкіх лабараторыях не толькі дапамагае больш шырокаму знаёмству кожнага з зацікавіўшым яго светам хіміі, але і мае значны ўплыў на школьнікаў у сэнсе станаўлення асобы. Нездарма ж удзельнікі такіх алімпіяд пасля заканчэння школы ідуць на хімфак.

Нямала робяць выкладчыкі хімічнага факультэта для падрыхтоўкі і правядзення штогадовай алімпіяды школьнікаў: рыхтуюць задачы для тэарэтычнага і практычнага тураў, правяраюць іх рашэнні, непасрэдна прысутнічаюць пры правядзенні эксперыменту. У мінулым годзе быў абагульнены вопыт правядзення рэспубліканскіх алімпіяд па хіміі. Вынікам абагульнення стаў «Зборнік алімпіядных задач па хіміі».

Заглянем напаследак да дзесяцікласнікаў. Яны ўжо заканчваюць апісанне работы, здаюць сшыткі, прыбіраюць сталы. Вось накіроўваецца да дзвярэй Аляксандр Усовіч з Гомеля. Трэці раз ён удзельнічае ў рэспубліканскай алімпіядзе. Вельмі любіць хімію. Але на пытанне аб тым, ці збіраецца стаць хімікам, адказвае адмоўна. Саша марыць аб іншай прафесіі. А вось Ігара Міхедава з Жодзіна і Аляксандра Плавінскага з Латыгольскай сярэдняй школы Вілейскага раёна мы абавязкова сустрэнем у жніўні сярод абітурыентаў хімфака.

**Т. САХАШЧЫК.**

**ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ ПРАВЕДЗЕНА КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА АБМЕНУ ВОПЫТАМ АРГАНІЗАЦЫІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ НА РОЗНЫХ ФАКУЛЬТЭТАХ. АСОБНЫЯ ВЫСТУПЛЕННІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ПЕДАГАГІЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ПРАПАНОЎВАЕМ УВАЗЕ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ.**

# СЁННЯ—ЯКАСЦЬ ВЕДАЎ І НАВЫКАЎ, ЗАЎТРА—ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦЫ

## Адказнасць за настаўніка

НАЎРАД ці зможа хто сёння ўявіць сабе працэс падрыхтоўкі любога спецыяліста, пры якім адсутнічала б вытворчая практыка. Савецкая вышэйшая педагагічная школа назапасіла значны вопыт падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў вышэйшай кваліфікацыі. І ў гэтай рабоце, на ўсіх этапах яе, арганізацыі педагагічнай практыкі адводзілася важнае месца. І гэта заканамерна, бо фарміраванне высокіх прафесійных якасцей будучага настаўніка немагчыма без высокай і глыбока прадуманай сістэмы практычнай падрыхтоўкі.

Эфектыўнасць педагагічнай практыкі залежыць у немалой ступені ад тэрміну яе правядзення, арганізацыі і кіраўніцтва. У нашым універсітэце працягласць педагагічнай практыкі на розных факультэтах вагаецца ад аднаго да некалькіх месяцаў. Так, на завочным аддзяленні гістарычнага і на вячэрнім біялагічнага факультэтаў тэрмін практыкі быў скарочаны да 14—15 дзён. За гэты кароткі прамежак часу студэнтам вельмі цяжка пазнаёміцца з работай у школе. На дзённых аддзяленнях большасці факультэтаў педагагічная практыка праводзіцца на працягу месяца. У гэтым годзе механіка-матэматычны факультэт адшукаў магчымасці для правядзення педагагічнай практыкі студэнтаў педагагічнага патока на працягу больш 4 месяцаў: з лістапада па сакавік уключна. Безумоўна, студэнты змаглі добра замацаваць веды, якія яны атрымалі ў працэсе тэарэтычнага навучання, набыць неабходныя навыкі, наогул пазнаёміцца з будучай прафесіяй непасрэдна ў школе. Відавочна, кіраўніцтва іншых факультэтаў, аддзел педагагічнай практыкі павінны адшукаць магчымасці для павелічэння часу на педагагічную практыку.

Вялікае значэнне мае падбор школ для правядзення педагагічнай практыкі. Як правіла, школы, якія знаходзяцца ў цэнтры горада, вельмі загружаны практыкантамі. У іх, акрамя нашых, праходзяць практыку студэнты педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага і інстытута замежных моў. Вялікая канцэнтрацыя студэнтаў у адной школе не садзейнічае эфектыўнай арганізацыі педагагічнай практыкі, дрэнна сказваецца на паспяховасці вучняў.

Студэнты вячэрняга аддзялення біялагічнага і часткова хімічнага факультэтаў праходзяць практыку ў вячэрніх школах працоўнай моладзі г. Мінска. Заслугоўвае адабрэння і ўсялякай увагі вопыт арганізацыі педагагічнай практыкі на вячэрнім аддзяленні геаграфічнага факультэта, кіраўніцтва якога адмовілася ад накіравання студэнтаў вячэрняга аддзялення ў школы працоўнай моладзі. Усе студэнты-географы праходзяць практыку ў дзённых сярэдніх агульнаадукацыйных школах. Гэта рашэнне цалкам апраўдана, бо педагагічная практыка на гэтых аддзяленнях кароткатэрміновая. Практыканту пажадана быць поўны тыдзень у школе. У вячэрняй жа школе студэнт можа быць толькі 4 дні ў тыдзень. Акрамя таго, у вячэрніх школах працоўнай моладзі ёсць і іншыя негатыўныя бакі, якія адмоўна адлюстроўваюцца на паспяховасці праходжання педагагічнай практыкі.

Часцей за ўсё ў адной школе праходзяць педагагічную практыку адна ці дзве групы студэнтаў аднаго і таго ж факультэта. Гэта мэтазгодна па многіх прычынах: па-першае, можна лепш здзяйсняць кіраўніцтва, па-другое, студэнты маюць магчымасць назіраць, як праводзяць урок іх таварышы, набываюць навыкі аналізу ўрока і г. д. Аднак ёсць выпадкі, калі ў школу накіроўваюцца па аднаму студэнту.

Эфектыўнасць педагагічнай практыкі ў многім залежыць ад узроўню яе кіраўніцтва. З гэтай мэтай падбіраюцца групавыя кіраўнікі з ліку дацэнтаў, выкладчыкаў універсітэта і лепшых настаўнікаў г. Мінска. У кіраўніцтве педагагічнай практыкай прадаўжаюць дзейнічаць дзве тэндэнцыі: першая — празмерная апека студэнтаў-практыкантаў кіраўнікамі, метадыстамі, прадстаўнікамі кафедры педагогікі і псіхалогіі, другая — поўнае вызваленне практыканта ад дапамогі і кантролю кіраўніка. Першая тэндэнцыя характэрна для педагагічнай практыкі ў школах г. Мінска. Другая тэндэнцыя дзейнічае ва ўмовах праходжання студэнтамі практыкі ў сельскай мясцовасці ці іншых гарадах. Асабліва нізкі ўзровень кіраўніцтва педагагічнай практыкай у студэнтаў завочных аддзяленняў. Напрыклад, студэнты-практыканты завочных аддзяленняў, якія праходзяць педагагічную практыку ў Гродзенскай, Магілёўскай і іншых абласцях, фактычна не атрымліваюць кваліфікаванага кіраўніцтва практыкай з боку універсітэцкіх выкладчыкаў. Місія апошніх часцей за ўсё зводзіцца толькі да праверкі справаздачных дакументаў.

Ёсць цяжкасці з забеспячэннем студэнтаў падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі, па якіх працуюць школы. Ва універсітэце няма дастатковай колькасці школьных падручнікаў. Набыць самім студэнтам іх проста немагчыма, бо школьныя падручнікі зараз у магазінах не прадаюцца. Дрэнна забяспечаны студэнты і метадычнай літаратурай.

Кафедра педагогікі ў гэтым годзе выдала дапаможнік «Педагагічная практыка студэнтаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна». У гэтым дапаможніку можна знайсці асноўныя інструктыўныя палажэнні па педагагічнай практыцы студэнтаў універсітэта, а таксама прафесіяграму класнага кіраўніка, прыкладны змест індывідуальнага плана работы студэнта ў перыяд практыкі, план работы па вывучэнню і фарміраванню асобы школьніка, прыкладную тэматыку дыспутаў для вучняў, прыкладныя тэмы піянерскіх збораў і камсамольскіх сходаў, пытанні прафарыентацыі і працоўнага выхавання, прыкладныя тэмы дакладаў для бацькоў, план падрыхтоўкі да напісання сачынення аб будучай прафесіі, прыкладны план агульнага аналізу ўрока, рэкамендацыі да аналізу мерапрыемстваў па пазакласнай рабоце. Гэты дапаможнік ахоплівае ўсе асноўныя раздзелы работы студэнта-практыканта ў школе. Аднак яго маюць не ўсе групавыя і нават факультэцкія кіраўнікі педагагічнай практыкі. А пажадана, каб кожны практыкант атрымліваў такі дапаможнік для сваёй штодзённай работы, з абавязковым яго звprotам пасля заканчэння педагагічнай практыкі ў кабінет методыкі ці ў кабінет педагогікі.

Важны і заключны этап педагагічнай практыкі студэнтаў — правядзенне выніковых канферэнцый. Такія канферэнцыі штогод праводзяцца на геаграфічным, філалагічным, механіка-матэматычным і іншых факультэтах. Аднак іх неабходна больш дакладна рыхтаваць. Цікавы вопыт філолагаў: на такія канферэнцыі абавязкова запрашаюцца студэнты малодшага курса, якія знаёмяцца з асноўнымі работамі студэнтаў-практыкантаў.

**А. СМАНЦАР.**

## ПРАКТЫЦЫ—НАВУКОВЫ ХАРАКТАР

СЁННЯ, як ніколі, школе патрэбны бездакорна падрыхтаваны настаўнік, які выкарыстоўвае самыя новыя метады навучання, валодае педагагічным майстэрствам, здольны адначасова вырашаць шматпланавыя задачы камуністычнага выхавання.

У БССР у кожнага чацвёртага настаўніка — універсітэцкі дыплом. З гэтага можна зрабіць вывад, якую адказнасць перад грамадствам нясуць універсітэты ў падрыхтоўцы педагагічных кадраў.

Мы прааналізавалі размеркаванне студэнтаў геаграфічнага факультэта за апошнія восем гадоў. Атрымліваецца, што каля 70 працэнтаў выпускнікоў штогод накіроўваюцца на работу ў сярэднія школы. Натуральна, узнікае пытанне: як падрыхтаваць будучага настаўніка да прафесійнай дзейнасці? І шматгадовы вопыт работы паказвае, што будучым настаўнікам важна атрымаць у ВНУ не толькі глыбокія тэарэтычныя веды, але і ўсебаковую педагагічную і метадычную падрыхтоўку. А вось даць педагагічную падрыхтоўку, дапамагчы кожнаму выпускніку зразумець сутнасць педагагічнай працы і падрыхтаваць яго да такой працы можа толькі педагагічная практыка. Таму пры яе арганізацыі мы імкнёмся пасылаць студэнтаў на практыку ў лепшыя школы, дзе працуюць вопытныя настаўнікі-географы, энтузіясты, кіраваць студэнтамі прапануем вопытным метадыстам, даём дакладныя ўказанні па правядзенню практыкі. У кабінеце методыкі выкладання геаграфіі ў любы час студэнты могуць атрымаць кансультацыю, наглядныя дапаможнікі, неабходную літаратуру. Усё гэта садзейнічае таму, што большасць студэнтаў вельмі сур'ёзна рыхтуецца да ўрокаў і праводзіць іх на высокім узроўні.

Практычная падрыхтоўка будучага настаўніка не абмяжоўваецца толькі ўрокамі, хаця яны і з'яўляюцца асноўнай формай арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы ў школе. Спецыфіка геаграфіі дазваляе выкарыстоўваць розныя формы і метады пры правядзенні пазакласных і пазашкольных мерапрыемстваў па прадмету. Гэта выклікае свае цяжкасці пры іх падрыхтоўцы і правядзенні, але дапамагае прыцягнуць найбольш цікаўных і таленавітых вучняў да глыбокага вывучэння прадмета і ў нейкай ступені садзейнічае выбару іх будучай прафесіі.

Пры выкананні навуковай кафедральнай тэмы «Вывучэнне работы выпускнікоў геаграфічнага факультэта», акрамя традыцыйных сувязей, якія ўстанавіліся з выпускнікамі, мы выкарыстоўвалі метад анкецiравання. Было даслана больш 400 лістоў у школы, дзе працуюць нашы выпускнікі, у тэстах стаяла пытанне: «З якімі цяжкасцямі сутыкнуліся вы ў пачатку работы?» У большасці адказаў адзначалася пазакласная работа па прадмету і работа класнага кіраўніка. Выпускнікі маюць дастаткова добры тэарэтычны багаж у галіне геаграфіі і разам з тым не могуць поўнасцю рэалізаваць гэтыя веды на ўроках і ў час пазакласных мерапрыемстваў па прадмету. Вырашылі максімальна выкарыстоўваць педагагічную практыку.

Выконваючы праграму педагагічнай практыкі, студэнты праводзяць вялікую работу па прадмету, прымаюць удзел у рабоце факультатываў і геаграфічных гурткоў, чытаюць лекцыі па ахове прыроды, рыхтуюць і праводзяць геаграфічныя вечары і канферэнцыі.

Разам з падрыхтоўкай урокаў і правядзеннем пазакласнай выхаваўчай работы кожны практыкант вядзе вучэбна-даследчую работу. Тэматыка яе распрацавана прафесарам В. А. Жучкевічам з улікам методыкі выкладання геаграфіі, пазакласнай работы, педагогікі.

Па кожнай тэме складаем план з улікам колькасці практыкантаў, якія замацаваны да школы, і кожны з іх атрымлівае індывідуальнае заданне ў даследаванні. Пры размеркаванні тэм улічваецца таксама спецыфіка кожнай школы. Назапашаны і абагульнены фактычны матэрыял па зададзенай тэме афармляецца ў выглядзе рэферата (даклада), з якім нашы студэнты выступаюць на выніковай канферэнцыі па педагагічнай практыцы.

Выніковая канферэнцыя па педагагічнай практыцы набывае пры такой сістэме заданняў не толькі справаздачны, але ў пэўнай меры і навукова-даследчы характар.

Трэба падкрэсліць, што ВДРС не выключае нічога з тых абавязкаў, якія павінен выконваць практыкант у час педагагічнай практыкі.

**З. АНДРЫЕЎСКАЯ,**
**старшы выкладчык кафедры мацерыкоў і акіянаў.**

## У школах—вячэрнікі

ПЕДАГАГІЧНАЯ практыка на вячэрнім аддзяленні хімічнага факультэта праводзіцца толькі другі год, і таму яе методыка яшчэ ў стадыі станаўлення. Спецыфіка навучання на вячэрнім аддзяленні абумоўлівае і спецыфіку правядзення практыкі. Вынікі першага года паказалі, што не ўсё ў яе арганізацыі было дасканала. Сёлета змяніліся базы практыкі. Яна праводзілася ў дзённых школах з добра абсталяванымі хімічнымі кабінетамі і пад кіраўніцтвам вопытных настаўнікаў.

Метадысты і настаўнікі школ адзначаюць, што студэнты вячэрняга аддзялення паспяхова прайшлі практыку. Яны хутчэй, чым студэнты дзённага аддзялення, знаходзілі кантакт з класам, на ўроках адчувалі сябе больш упэўненымі. Да падрыхтоўкі і правядзення ўрокаў і мерапрыемстваў па пазакласнай рабоце адносіліся вельмі сур'ёзна і з вялікім інтарэсам. Пры падвядзенні вынікаў практыкі імі былі выказаны канкрэтныя пажаданні, якія акажуць значную дапамогу ва ўдасканаленні метадаў правядзення педагагічнай практыкі.

**Т. АДАМОВІЧ,**
**дацэнт кафедры неарганічнай хіміі.**

## ВУЧЫЦЬ АКТЫЎНАСЦІ

У ЧАС АПОШНЯЙ педагагічнай практыкі студэнтам фізічнага факультэта, акрамя правядзення запланаваных урокаў, шмат давялося замяняць захварэўшых выкладчыкаў. Яны старанна рыхтаваліся да заняткаў. І, як адзначаюць кіраўнікі практыкі, урокі былі праведзены ў асноўным на ўзроўні, правільна аснашчаны неабходнымі нагляднымі дапаможнікамі. Акрамя таго, студэнты азнаёмлены са структурай грамадскіх арганізацый школ, удзельнічалі пад кіраўніцтвам настаўнікаў у выхаваўчай рабоце, праводзілі разнастайныя пазакласныя мерапрыемствы: палітінфармацыі, бацькоўскія сходы, чыталі лекцыі, арганізоўвалі фізічныя алімпіяды і тыдні фізікі, тэматычныя вечары, экскурсіі на прадпрыемствы горада, дапамагалі выпускаць насценгазеты. За час педагагічнай практыкі выканана значная работа па афармленню фізічных кабінетаў.

Па меркаванню супрацоўнікаў школ, дзе праходзілі практыку выхаванцы фізфака, нашым студэнтам уласцівы стараннасць і ўважлівыя адносіны да педпрактыкі. Адзначана недастатковае ўменне валодання класам, заўважаны недахопы ў навыках вядзення гутаркі з вучнямі і г. д. Але такія прафесійныя навыкі вельмі складана атрымаць за кароткі час.

**С. ГАЛКО,**
**старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі.**

● КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР

# НА ВЁСКУ, ДЗЯДУЛІ...

ЧЫТАЧ, пэўна, яшчэ з маленства добра памятае Ваньку Жукава, які адрасаваў сваё пісьмо проста «на вёску, дзядулі...». Якія былі часы! Дастаткова напісаць, скажам: «Мінск, Малая паваротная вуліца, трэці дом ад вугла, купчысе Гусаковай» ці: «Магілёў, Пастаялы двор, дворніку Цімафею», і пісьмо знаходзіла адрасата. Цяпер такое ўспрымаецца з усмешкай. Наша імклівае 20-е стагоддзе звязала ў адзіны вузел тысячы людзей, арганізацый, устаноў, цэлыя краіны. Вось і ляцяць самалётамі, плывуць параходамі, едуць цягнікамі і аўтамабілямі, перамяшчаюцца на аленях і вярблюдах, паскрыпваюць у цеснай паштальёнскай сумцы пісьмы: звычайныя і заказныя, асабістыя і афіцыйныя, ад дзяцей бацькам і ад бацькоў дзецям. Іх нецярпліва чакаюць і дзеці, і бацькі, і закаханыя, і адказныя работнікі. А чакаць даводзіцца, часам доўга. І не толькі дрэннае надвор'е таму прычынай.

У лютым і сакавіку ўраганы і навальніцы міналі, здаецца, нашу сталіцу. Але звыш месяца чакалі адрасаваныя ім пісьмы Марыя Ганяецкая, якая пражывае на вуліцы Беларускай, дом 19, кіраўніцтва ПМК № 109, якое знаходзіцца на вуліцы Антонаўскай, дом 2, студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі БДУ імя У. І. Леніна Галіна Кандрацьева, жыхарка дома № 10 па вуліцы Кастрычніцкай. Не віхура закінула гэтыя (і яшчэ многія, многія іншыя) лісты ў паднябессе, адкуль іх шлях да адрасатаў быў такім працяглым. Віноўнікі гэтага — работнікі Мінскага паштовага аддзялення нумар 30.

У той час, калі адрасаты нецярпліва чакалі свае пісьмы, яны (гэтыя пісьмы) спакойна ляжалі ў паштовай скрынцы інтэрната № 2 па вуліцы Кастрычніцкай, дом № 2, куды іх па сваёй неахайнасці даставілі работнікі аддзялення сувязі № 30. На жаль, гэта гісторыя не выключэнне, а хутчэй правіла. 28 сакавіка Ліхтарыкам была праведзена праверка правільнасці дастаўкі пошты ў інтэрнаты №№ 2, 6, 7. Выяўлена, адпаведна, 26, 12 і 17 пісьмаў, дастаўленых не па адрасу. І гэта толькі па трох інтэрнатах! Дарэчы, колькі ж усяго пісьмаў, адрасаваных студэнтам універсітэта, блукаюць вось так за-за безадказнасці работнікаў АС № 30? І як доўга гэта будзе працягвацца? Ліхтарык чакае адказу.

У падрыхтоўцы матэрыялу Ліхтарыку дапамагалі студэнты факультэта журналістыкі І. ЗЫБАЙЛА і В. ЖЫРКЕВІЧ.

● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# ФЕСТЫВАЛЬ САЛІДАРНАСЦІ

НАВОКАЛ было незвычайна, цікава, весела і шумна. Твары — узбуджаныя, жыццярадасныя. І спачатку цяжка было сарыентавацца: хацелася ўбачыць усё адразу. У Палацы культуры аўтазавода — фестываль салідарнасці моладзі.

Другі год запар збіраюцца разам студэнты ўсіх ВНУ горада Мінска, каб выразіць пратэст планам Вашынгтона, сказаць «не» гонцы ўзбраенняў.

Арганізатары фестывалю — мінская гарадская камісія садзейнічання савецкаму Фонду міру, мінскі гарадскі камітэт Саюза свабоднай нямецкай моладзі, камітэт камсамола Мінскага аўтамабільнага завода, клуб інтэрнацыянальнай дружбы «Адзінства». Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні фестывалю прынялі студэнты БДУ. Сярод гасцей —студэнты з Грэцыі, Кубы, В'етнама, Йемена, іншых краін свету, прадстаўнікі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта.

Маладзёжны фестываль — гэта заўсёды жарты і смех, спаборніцтвы і атракцыёны, новыя сябры і новыя ўражанні. У праграме — ярмарка. Вось мы ля кіёска, які ўвесь увешаны плакатамі, фатаграфіямі, календарамі. На прылаўку — кнігі, паштоўкі, сувеніры і інш. Купляй, што падабаецца. А ўсе грошы, атрыманыя на фестывалі, пойдуць у савецкі Фонд міру.

Крыху далей — група нечым зацікаўленых юнакоў і дзяўчат. Тут працуе гурток «Умелыя рукі». Вам прапаноўваюць навучыцца рабіць з простага аркуша паперы прыгожага жураўліка, сплесці з нітак адмысловае ўпрыгожанне ці нават сумку. Жадаючых паспрабаваць свае сілы і праявіць спрыт шмат. Заўважым: усе папяровыя жураўлікі, якія зрабілі ўдзельнікі фестывалю, адпраўлены ў японскае пасольства ў Маскву ў знак салідарнасці з японскімі барацьбітамі за мір. Гісторыя Хірасімы і Нагасакі не павінна паўтарыцца!

Ідзём далей. Вось сабраліся «мастакі»: падыходзь, бяры ліст ватмана, пэндзаль, фарбы —і малюй, што табе падказвае свядомасць і фантазія. Плакаты павінны быць палітычна накіраванымі.

У буфеце — шмат нацыянальных страў, якія прыгатавалі таксама самі студэнты, прадстаўнікі розных краін свету. Як тут утрымаешся — усё хочацца паспрабаваць. Але трэба спяшацца: праз 5 мінут пачнецца асноўная частка вечара — канцэрт.

...У нацыянальных касцюмах танцоры з Йемена. Спявае ансамбль грэчаскіх студэнтаў «Венсэрэмас». Усхвалявана чытае вершы на роднай мове в'етнамская дзяўчына. У выкананні нямецкіх студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ, гучаць палітычныя частушкі. Артысты ТЮГа паказваюць урыўкі з п'есы М. Астроўскага «Як гартавалася сталь». А ў заключэнне ўся зала спявае: «Дзеці розных народаў...»

Падыходзіць к канцу фестываль, закрываецца ярмарка. Але ніхто не разыходзіцца. Доўгая чарга стаіць да стала, дзе ідзе збор подпісаў удзельнікаў фестывалю салідарнасці.

«Мы супраць вайны, за мір ва ўсім свеце. Няхай заўжды будзе сонца!» — патрабуюць удзельнікі фестывалю.

**В. ЖУРАК,**
**студэнтка філфака, слухач аддзялення журналістыкі ФГП.**





Журы універсітэцкага агляду мастацкай самадзейнасці таў вызначыла як лепшую па падрыхтаванасці, ідэйнай фізічнага факультэта. Пераможцай сярод дэкламатараў стала Кузняцова. Першае месца ў групе салістаў заняў інжынер ны мужчынскі ансамбль фізфака, а ў танцах не было роўных прафесарска-выкладчыцкага саставу, супрацоўнікаў і аспіранi тэматычнай накіраванасці, а таксама па масавасці праграму супрацоўніца дэканата па навучанню замежных студэнтаў Н. А. вылічальнага цэнтра В. С. Лабуноў. Сярод ансамбляў вызначасупрацоўніцы біяфака А. Бяловай і яе партнёру В. Ляшэнку.

● СПОРТ ●

# Кулі трапляюць у цэль

БАГАТАЕ падзеямі спартыўнае жыццё студэнтаў універсітэта ў гэтым годзе. Толькі закончыліся апошнія зімнія старты па лыжнаму спорту і мнагабор'ю ГПА, як настаў час праводзіць першынство універсітэта па кулявой стральбе, якое праходзіла з 22 па 26 сакавіка.

У першы дзень юнакі і дзяўчаты выконвалі практыкаванне МП-1. Дзесяць стрэлаў з малакаліберунага пісталета. З вынікам 94 ачкі са 100 магчымых перамогу атрымаў І. Шыпілаў — студэнт гістарычнага факультэта, які выканаў нарматыў другога разраду. Лепшы вынік сярод дзяўчат у гэтым практыкаванні належыць студэнтцы хімічнага факультэта Н. Судлёнкавай— 75 ачкоў.

Другі дзень—практыкаванне МП-4. Першым сярод юнакоў стаў студэнт ФПМ У. Галябовіч. Яго вынік—268 з 300, што адпавядае III разраду. У дзяўчат перамагла студэнтка фізічнага факультэта А. Рэбрына— 288 ачкоў.

Наступнае практыкаванне— стральба з малакаліберунай вінтоўкі. Гэта практыкаванне было самым шматлюдным: у яго выкананні прыняло ўдзел 44 чалавекі. Лепшы вынік быў—97 ачкоў. Ён належыць студэнту юрыдычнага факультэта С. Акалоту. Парадавала студэнтка біялагічнага факультэта А. Корань. Яе вынік — 100 ачкоў са 100 — быў першым, і паўтарыць яго не давялося нікому.

Завяршаючым этапам спаборніцтва стала практыкаванне МВ-7—стральба з трох становішчаў: лежачы, стоячы і з калена. Лепшыя вынікі паказалі студэнт філфака А. Радзевіч— 285 з 300 і А. Жалудко—студэнтка ФПМ. Яе вынік—263.

Месцы сярод факультэтаў размеркаваліся наступным чынам: гістарычны, ФПМ, механіка-матэматычны, біялагічны, геаграфічны і фізічны, філалагічны і юрыдычны, факультэт журналістыкі, хімічны, радыёфізічны.

Вынікі першынства радуюць: 14 чалавек выканалі нарматывы II і III разрадаў. У чытача можа ўзнікнуць пытанне, чаму ніхто не выканаў першы разрад? Справа ў тым, што выкананне нарматыву I разраду патрабуе памяшкання даўжынёй 50 метраў, а наш універсітэцкі цір мае толькі 25 метраў. Трэба адзначыць, што становішча са стралковым спортам ва універсітэце даволі нядрэннае. Рэгулярна праводзяцца трэніроўкі, на якіх студэнты маюць магчымасць не толькі авалодваць практычнымі навыкамі, але атрымліваць і тэарэтычныя веды.

**У. БЯЛОЎ,**
**студэнт журфака.**

# НА СПАРТАКІЯДЗЕ РЭСПУБЛІКІ

ПРАЦЯГВАЕЦЦА XXV спартакіяда Беларусі сярод ВНУ. Па новаму палажэнню спартакіяды поспех той ці іншай навучальнай установы залежыць ад колькасці спартсменаў, якія выступаюць за зборныя каманды абласнога савета СДСТ «Буравеснік».

Спартакіяда праводзіцца па некалькіх падгрупах. Разам з нашай камандай выступаюць каманды БДІНГ, БПІ, ГДУ, ВПІ, МРТІ і БІМСГ.

Першыя старты паказалі, што спартсмены універсітэта паспяхова выступаюць за абласныя каманды па розных відах спорту. Вялікі поспех выпаў на долю лёгкаатлетаў і барцоў класічнага стылю, якія заваявалі першыя месцы, а таксама каманд па фехтаванню і вольнай барацьбе.

Чэмпіёнамі і прызёрамі СДСТ «Буравеснік» сталі лёгкаатлеты Т. Бойка, Т. Касцюніна, Л. Хмялеўская, М. Войтава, А. Тавароўская, А. Чурак, Т. Міраноўская, Г. Хадаркевіч, Д. Гілевіч, І. Долбік, В. Бойка, А. Семяновіч, С. Валанцэвіч, С. Багданчук, С. Лабко, Ю. Шышкевіч, І. Данільчанка, Н. Бяжок.

Іх падтрымалі барцы класічнага стылю В. Харук, А. Харанека, М. Рубіс, «вольнікі» А. Бярозка, Н. Папоў, М. Чаркашын, С. Цітоў, М. Трыфанаў.

Вялікі ўклад у паспяховае выступленне каманды ўнеслі фехтавальшчыкі М. Фабрыкант, С. Элчакян, В. Папрацінскі.

Сярод каманд у асобных відах спорту хочацца адзначыць выступленне зборнай па біятлону, якая заняла другое месца, а ў асабістым заліку Г. Закрэўскі і В. Глазуноў былі першымі, В. Цішкевіч — другім.

Слабей выступілі астатнія нашы каманды. Плыўцы і хакеісты занялі 5-е месца, а лыжнікі і горналыжнікі — 6-е.

Цяпер наша галоўная задача — паспяхова выступіць у летніх відах спорту.

**Н. КРОЙТАР.**

# АКТЫВІЗАВАЛІ РАБОТУ

ВЯЛІКУЮ работу па прыцягненню студэнтаў да заняткаў фізічнай культурай праводзіць спартыўна-масавая камісія інтэрната № 1. Абсталявана спартыўная зала, на першым паверсе афармлены куток, дзе можна пазнаёміцца з інфармацыяй аб спартыўных дасягненнях жыхароў інтэрната. Пастаянна вывешваюцца маланкі-віншаванні і аб'явы, па якіх студэнты сочаць за спартыўным жыццём факультэта і універсітэта.

Часта праводзяцца ў нас і свае спартыўныя спаборніцтвы. Напрыклад, у першынстве інтэрната па шахматах I месца заняў М. Русаковіч. Паралельна з першынствам факультэта прайшло першынство інтэрната па міні-футболу. Хочацца адзначыць П. Гарбуля, Б. Кручкова, А. Гайдэля, П. Даўгялу, А. Размысловіча і іншых, якія аказалі значную дапамогу ў правядзенні матчаў.

Акрамя таго, у інтэрнаце вядзецца значная работа па прапагандзе спорту. Арганізуюцца лекцыі аб Алімпійскіх гульнях, гутаркі аб лепшых спартсменах краіны, праводзяцца культпаходы ў выхадныя дні на розныя спаборніцтвы, якія адбываюцца ў Мінску, выпускаюцца спартыўныя фотагазеты.

Спадзяёмся, што паспяховая работа спартыўна-масавай камісіі інтэрната будзе і далей весціся з такім запалам і энтузіязмам.

**В. ЯКУШЭВІЧ,**
**студэнт гістфака.**

● СПОРТ ●

# ВЫПУСКНІК

УРА! Мы перайшлі на апошні курс! Зараз можна бязбоязна заходзіць ва універсітэт, як належыць дыпломніку, упэўнена прайсціся па калідорах. Смела зазіраць у кіназалы і аўдыторыі. Сустрэць першакурсніка, паблажліва паляпаць яго па плячы, убачыць аспіранта, добразычліва пацiснуць яму руку.

...Мы сядзім на лаўцы ў скверы і марым, марым, марым..

Толькі Ваня Маслаў штосьці засумаваў. Што за думкі мрояцца ў яго галаве, не зразумець нават нам, людзям, без пяці мінут з вышэйшай адукацыяй.

— Аб чым задумаўся, выпускнік? Відаць, абдумваеш дыплом?

— Дыплом, браткі, гэта не праблема. Вось замежную мову здаць хаця б за трэці курс...






# ІНТЭРВ'Ю

ПАДЫШОЎ я да яе на кінафестывалі пасля прагляду фільма з блакнотам і пытаю:

— Вам спадабаўся гэты фільм?

— Спадабаўся,— усміхнулася яна.— А чаму вы выбралі іменна мяне? Я ж простая мінская студэнтка.

— А мяне якраз і цікавіць думка простай мінскай студэнткі, — растлумачыў я.— Які акцёр вам асабліва спадабаўся?

— Баярскі.

— Як вас зваць?

— Наташа.

— Колькі вам гадоў?

— Дзевятнаццаць. А вы з якой газеты?

— А я не з газеты.

— А адкуль?

— Ніадкуль. Я просты мінскі студэнт.

— А ну, рухай адсюль, студэнт!—закрычала Наташа. — Чаго прывязаўся?

— Эх, Наташа,—уздыхнуў я,—шкада, што мы з вамі не сышліся характарамі.

І пайшоў браць інтэрв'ю ў другіх мінскіх студэнтак.

# АДНОЙЧЫ...

***

на лекцыі па гісторыі філасофіі выкладчык, знаёмячы з біяграфіяй Сакрата, сказаў:

— І вось у канцы свайго жыцця вялікі філасаф заявіў: «Я ведаю, што я нічога не ведаю...»

У гэты час Валодзя Яфрэмаў, які звычайна ціха драмаў недзе на апошніх радах, схамянуўся і сумна прамовіў:

— Вось і мяне тое ж самае чакае...

***

ва універсітэт прыехаў вядомы ўрач-псіхіятр, які свабодна валодае сродкамі гіпнозу: праводзіць цікавыя эксперыменты па выяўленню ў людзей творчых здольнасцей. Істотнасць вопыту ў тым, што чалавеку пад гіпнозам унушаецца, што ён вядомы дзеяч навукі або мастацтва. Пераўвасабленні бываюць цудоўнымі!

Пасля тэарэтычнай часткі выступлення пачалася дэманстрацыя вопытаў. Псіхіятр запрасіў аднаго са студэнтаў на сцэну і, зрабіўшы шэраг маніпуляцый,ператварыў яго ў Пятра Ільіча Чайкоўскага.

«Пётр Ільіч» з вялікім натхненнем паведаміў аб сваім разуменні музыкі, а калі гіпнацізёр спытаў, над чым ён зараз працуе, той ганарліва хмыкнуў і адказаў:

— Над «Луннай санатай»...

Далейшую дэманстрацыю вопыту давялося супыніць — у зале стаяў неапісальны рогат.

## ПАРАДЫ ПАЧЫНАЮЧАМУ БУДАТРАДАЎЦУ

**● СТАЯЦЬ пад грузам у зялёным гарнітурчыку і чырвонай хустачцы безгустоўна.**

**● НЕ КУРЫ на бочцы з бензінам — могуць падумаць, што ты дрэнна выхаваны.**

**● НЕ РЭКАМЕНДУЕЦЦА насіць насілкі з бетонам адной рукой. Можа скласціся ўражанне, што вы адпачываеце.**

**● КАЛІ ХТО-НЕБУДЗЬ незнарок скінуў вам на галаву цэглу, лепш за ўсё не крычаць, а перавесці ўсё гэта ў жарт.**

# ПОБАЧ З НАВУКАЙ

●

ЗРАЗУМЕЦЬ механізм працэсаў, якія адбываюцца ў арганізме чалавека пад уздзеяннем алкаголю, спрабуе малады вучоны Любазнайкін (кафедра анатоміі і фізіялогіі чалавека). У гэтым актыўную дапамогу аказвае сантэхнік Гоша. Учора іх бачылі ва ўзрушаным стане ў гарадскім скверы. Сёння раніцай — каля дзвярэй выцвярэзніка. Навуковы пошук працягваецца...

●

СВОЙ РУХ па службовай лесвіцы ўніз ён тлумачыў панавуковаму: уплывам зямнога прыцягнення.

●

АБ ТЫМ, што ў справе дасягнуты поўны прагрэс, дакладчык выказаўся вельмі невыразна.

●

ЮНАЕ дараванне прыпынілася на паўдарозе да поспеху: за страту пропуску яго на рэспубліканскае радыё не прапусціў вахцёр.



# АБ'ЯВЫ

●

МАЛАДОЙ сям'і з двух чалавек тэрмінова патрабуецца пакой ці кватэра на 2—3 гады.

Звяртацца штодзённа з 22.00 да 7.00, чыгуначны вакзал, зала для транзітных пасажыраў, крайняя ў правым вуглу лаўка.

●

ТЭРМІНОВА прадаецца поўны збор школьных сачыненняў на фатаграфіях.

●

У СУВЯЗІ са стратай кваліфікацыі дыплом, выдадзены на імя Казлішчава А. А., лічыць несапраўдным.

●

ТЭРМІНОВА пазычу тры рублі да зарплаты. Прапаноўваць па тэлефоне (лічбы не разабраць).






**● НАША ДЫСКАТЭКА ●**






**ЛІРЫЧНА-ІРАНІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ КАТЭГАРЫЧНА ВІНШУЕ ЧЫТАЧОЎ СА СВЯТАМ 1 КРАСАВІКА!**

**ПРОСІМ: «АЎТАРА!!!» НЕ ВЫКЛІКАЦЬ.**

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

АСТРОНОМ — торговец цветами

АВТОСТРАДА — механизированная уборка урожая

ГОЛОД — футбольный репортаж

ОЦЕПЕНЕТЬ — превратиться в собаку

ЗЕМЛЕТРЯСЕНИЕ — степень глубокого опьянения

ГОНЧАР — самогонщик

ДЕПЕША — попутчица

ЛИЦЕВАТЬ — бить руками по щекам

ПОПОНА — жена попа

ПРЕЛЮДИЯ — последняя ступень в эволюции животных

ПРОЦЕДУРА — степень понижения интеллекта

РАЗНАРЯДКА — манекенщица

РЕССОРА — примирение

РЕНТГЕН — наследственность взаймы

СТАРШИНА — покрышка, бывшая в употреблении

СТИМУЛ — погонщик мулов

СТОЛБНЯК — твердолобый

СЫР-БОР — лес после дождя

ТРУБАДУР — законченный человек

ШАХМАТЫ — нецензурные выражения на высшем уровне

МОНОЛОГ — однокомнатная квартира


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

1 красавіка 1982 г.

АТ 21191 Заказ 664.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ